УДК 947.6:37

В. М. Астрога, асістэнт

# АСНОЎНЫЯ НАКІРУНКІ ДЗЕЙНАСЦІ ПЕДАГАГІЧНЫХ ТАВАРЫСТВАЎ УЗАЕМАДАПАМОГІ І ІХ РОЛЯ Ў ФАРМІРАВАННІ САЦЫЯЛЬНА-ПРАВАВОГА СТАТУСУ НАСТАЎНІЦТВА БЕЛАРУСІ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIX – ПАЧАТАК XX СТ.)

The article shows the main directions of activities of pedagogical societies of mutual help and their role in formation of a social-legal status of teachers in Belarus in the second half of the XIX-th – the beginning of the XX-th centuries.

Народная асвета ў Расіі ў канцы XIX – пачатку XX ст. развівалася з небывалай да гэтага часу хуткасцю. Асноўнымі фактарамі гэтага развіцця былі рэзка ўзросшыя патрабаванні краіны ў адукацыі і энергічная грамадская дзейнасць у галіне асветы. Грамадска-педагагічны рух канца XIX ст. быў несуразмерна больш шырокім і арганізаваным, чым на папярэдніх этапах. Важнейшай яго праявай стала стварэнне перадавымі коламі настаўніцтва педагагічных таварыстваў узаемадапамогі.

Да 1890 г. у Расійскай імперыі існавалі толькі 4 настаўніцкія аб'яднанні, у 1895 г. іх было ўжо 14. Як толькі настаўніцкая ініцыятыва стала прыкметнай, Міністэрства асветы паспяшалася скіраваць яе ў належнае рэчышча. У 1894 г. быў выдадзены «Статут таварыства ўзаемнай дапамогі навучэнцам і настаўнікам». Згодна яму, таварыствы маглі мець мэты толькі матэрыяльнай узаемадапамогі. У склад праўленняў былі ўведзены ў якасці назіральнікаў за кірункам іх дзейнасці члены ад міністэрства. На аснове статута на мяжы стагоддзяў пачалі ўзнікаць прафесійныя настаўніцкія аб'яднанні. У снежні 1897 г. заснавана першае на Беларусі «Таварыства ўзаемнай дапамогі настаўнікам і настаўніцам Віцебскай губерні». Дз. І. Ціхаміраў, стваральнік і першы кіраўнік таварыства, адзначыў, што «прыйсці на дапамогу настаўнікам і настаўніцам народных вучылішчаў – наш абавязак і наша павіннасць» [1].

У 1901 г. такія ж таварыствы ўзніклі ў Мінску, Магілёве і Гродне. Яны мелі шматгалінowую сетку. Так, у 1903 г. Віцебскае таварыства атрымала права адкрыць свае аддзяленні ў паветах, а ў Магілёўскім у 1912 г. ужо было 10 павятовых аддзяленняў – у Гомелі, Сянно, Рагачове, Быхаве, Оршы, Клімавічах, Чавусах, Чэрыкаве, Горках і Мсціслаўі [2]. Кожнае з таварыстваў мела свой статут, але ўсе яны былі вельмі падобныя. Мэта іх дзейнасці была агульнай: «дапамагаць тым, хто знаходзіцца ў беднасці, хто вучыць і вучыў у сельскіх і гарадскіх (хрысціянскіх) пачатковых народных вучылішчах, грашовымі дапамогамі і іншымі відамі» [3]. Сапраўднымі членамі таварыстваў маглі быць толькі асобы, якія працавалі настаўнікамі, і тыя, хто па хваробе ці старасці пакінулі службу. Сродкі складаў капітал, сабраны іх членамі, членскія ўзносы, ахвяраванні, дабрачыннасць, сродкі, сабраныя на публічных лекцыях, канцэртах, вечарынах.

Праўленні таварыстваў звярталіся за падтрымкай да Міністэрства адукацыі, земскіх упраў, грамадскасці. Паступленні грошай на рахункі былі нязначнымі. У рашэннях валасных сходаў вельмі часта можна было прачытаць наступнае: «...з прычыны мізэрных сродкаў, якія маюць сяляне, прыняць удзел у дапамозе вучачым і вучыўшым не прызнаём магчымым» [4]. Сельская грамадскасць ж Магілёўскай губерні найбольш шчыра адгукнулася на просьбу: у 1901 г. сабрала дапамогу на 3000 руб. Падтрымлівалі таварыствы і земскія ўправы. Выручка ў 1000 руб. на карысць настаўнікаў Віцебскай губерні была атрымана праз арганізацыю спектакля. Але большую частку даходаў складалі членскія ўзносы.

Дзейнасць таварыстваў праяўлялася галоўным чынам у выдачы праўленнямі пазык і назначэнні беззваротных грашовых выдаткаў тым настаўнікам, якія найбольш патрабавалі дапамогі на выхаванне дзяцей, лячэнне, у сувязі з цяжкім матэрыяльным становішчам, паездкай на курсы і ў выпадку нейкіх няшчасцяў. На працягу першых трох гадоў Віцебскае праўленне аказала падтрымку 86 настаўнікам. Колькасць дапамог павялічвалася з ростам капіталу таварыства. У 1898 г. грошы атрымалі 12 асоб на агульную суму 330 руб. (Гарбачэўскаму, Квяткоўскаму – на лячэнне, Антаноўскаму – на выхаванне сына ў Віцебскай гімназіі, Хруцкаму – у выпадку знішчэння пажарам яго ўласнай маёмасці і інш.) [5]. У 1899 г. дапамогу атрымалі ўжо 34 настаўнікі (990 руб.), у 1900 г. – 40 (1140 руб.). Акрамя таго, Віцебскае праўленне забяспечвала сваіх настаўнікаў ільготнымі білетамі са скідкай 50% пры праездзе па Заходняй Дзвіне на параходах Гіндзіна і Рахмілевіча. У 1907 г. былі высланы 54 такія білеты. Дапамогі ішлі на выхаванне дзяцей, на перамяшчэнні па службе на новае месца (рабіў гэта настаўнік за свой кошт), у выпадках шлюбу, былым настаўнікам «для падтрымкі існавання» і інш. Самы высокі памер дапамогі 40 руб., а пазыкі – 60 руб. быў вызначаны агульным сходам [6]. С. Г. Малаха з Плотніцкага вучылішча падаў прашэнне аб дапамозе, бо «у дадзены момант на выхаванне траіх дзяцей (вучацца ў гімназіях ) і лячэнне жонкі зарплаты не хапае, не гаворачы ўжо пра дамашнія выдаткі, а іншых сродкаў для жыцця не маю». На-

стаўнік Пяражырскага вучылішча А. Глябко таксама прасіў падтрымкі «на паездку ў Самарскую губерню для лячэння кумысам, а таксама на лячэнне хворай дачкі» [7].

Калі на рахунках было мала грошай, многія звароты настаўнікаў заставаліся нявыкананымі. У 1908 г. у праўленне Гродзенскага таварыства было пададзена 80 «прашэнняў» аб грашовай дапамозе, але задаволена толькі 43: 7 яе членаў атрымалі дапамогу на лячэнне на агульную суму 220 руб., 7 – на выхаванне дзяцей (200 руб.), 5 – у сувязі з цяжкім матэрыяльным становішчам (136 руб.), 4 – на пахаванне (95 руб.) і інш. А Горацкае аддзяленне, якое мела ў 1912 г. усяго 113 руб. 20 кап., змагло толькі аднаму прасіўшаму аказаць дапамогу ў памеры 60 руб. [8].

Не ўсе настаўнікі былі задаволены працай праўленняў. У 1912 г. Віленскае таварыства выдала дапамогу на суму 300 руб. настаўнікам віленскіх і другіх гарадскіх пачатковых вучылішчаў. Прычым мінімум выдаткаў быў 30 руб., а максімум – 100 руб., а настаўнікам сельскіх вучылішчаў выдадзена ўсяго 135 руб. у памеры 20–40 руб. Вясковы настаўнік зрабіў выснову: «Для адных праўленне – маці, для другіх – мачаха, хоць узносы для ўсіх членаў аднолькавыя». 108 руб. было затрачана на ўтрыманне пісара і канцылярскія выдаткі, што абурыла яе членаў.

Важнай старонкай дзейнасці таварыстваў настаўнікаў з'яўлялася дапамога ў выхаванні дзяцей. Яна праяўлялася ва ўладкаванні інтэрнатаў для сыноў і дачок народных педагогаў, якія атрымлівалі адукацыю ў сярэдніх навучальных установах, і выдзяленні ім стыпендый. У 1901 г. Магілёўскае таварыства ўзняло пытанне аб адкрыцці ў горадзе прытулку для тых настаўнікаў, якія страцілі сваё здароўе і магчымасць працаваць, і пры ім інтэрната для дзяцей, якія вучыліся ў гімназіях горада. Яны былі б на поўным утрыманні за недарагую, пасільную для бацькоў-педагогаў плату. Такі інтэрнат удалося заснаваць, але ў канцы 1905 г. ён быў зачынены. У 1906 г. таварыства хадайнічала аб выдачы штогодніх субсідый на суму 2950 руб. Пазней таварыствам узнімалася пытанне і аб заснаванні ў горадзе настаўніцкага дома, які б мог служыць інтэрнатам для дзяцей-навучэнцаў, прытулкам для сіротаў і часткова кватэрай для прыязджаючых настаўнікаў. З-за адсутнасці сродкаў жаданне засталося без здзяйснення (на будаўніцтва патрабавалася 20 000 руб.) [9].

У 1905 г. Мінскае праўленне адкрыла інтэрнат для сыноў педагогаў, якія навучаліся ў гімназіях горада. На 1 студзеня 1910 г. тут жыло 7 вучняў. У 1912 г. пачаў сваю дзейнасць і жаночы інтэрнат для 15 дзяўчынак (хлопчыкаў у інтэрнаце ў 1912 г. было 21). У гэтай справе таварыству дапамагала Мінская гарадская ўправа, якая выдзеліла 400 руб. Дзеці змаглі атрымаць жыллё, харчаванне і паслугу за параўнальна невялікую плату. Асноўныя выдаткі несла таварыства: у месяц за стол вучняў яно плаціла 114 руб., за прыслугу – 20 руб., на невялікія расходы (пральня, дровы, лазня) – 10 руб. 90 кап. [10].

Гродзенскае таварыства таксама змагло адкрыць інтэрнаты для настаўніцкіх дзяцей у Слоніме і Брэсце. Выдаткі, напрыклад, з 1 жніўня да канца 1903 г. выходзілі: па Слонімскаму інтэрнату – 500 руб., па Брэсцкаму – 475 руб., у тым ліку па найму кватэр, ацяпленне, святло і мэблю. У першы ж год існавання гэтых інтэрнатаў у Слоніме памяшчалася 6 дзяцей і ў Брэсце – 8. Такім чынам, бацькі клапаціліся аб харчаванні, адзенні і падручніках, а кватэра давалася бясплатна.

Віцебскім таварыствам с пачатку стагоддзя быў заснаваны інтэрнат для настаўніцкіх дзяцей. Яго ўтрыманне патрабавала вялікіх выдаткаў. У 1907 г. на гэта ўжо было накіравана 2508 руб. 66 кап. З 1913 г. інтэрнат для дзяцей быў адчынены ўжо ў асабістым будынку таварыства. Гэты дом каштаваў 23 тыс. руб. Тут размясціліся 30 вучняў і вучаніц сярэдніх навучальных устаноў. Плата за карыстанне інтэрнатам была ўстаноўлена ў памеры 60 руб. у год, але 6 выхаванцаў у сувязі з цяжкім матэрыяльным становішчам іх бацькоў ад яе вызваляліся [11].

Істотную дапамогу ў выхаванні дзяцей аказала Віцебская губернская ўправа. У 1908 г. земства зацвердзіла 11 стыпендый (па адной на кожны павет) у памеры 60 руб. для выхаванцаў гімназій.

Недастатковы заробак, перапоўненыя класы, сырыя і цесныя асабістыя кватэры – усё гэта падрывала здароўе настаўнікаў і скарачала іх жыццё, а прастудныя, сардэчныя захворванні, сухоты і малакроўе станавіліся ўсё больш настаўніцкімі хваробамі. Сродкаў на лячэнне катастрафічна не хапала. Многім хворым настаўнікам урачы настойліва раілі спецыяльныя санаторыі і курорты. У «Настаўніцкіх календарах» часта змяшчаліся рубрыкі «Куды паехаць хвораму настаўніку». На кумыс накіроўваліся звычайна ў Пермскую і Самарскую губерні. Поўны пансіён, напрыклад, у Андрэеўскім санаторыі ў месяц каштаваў 115 руб. Для хворых на туберкулёз «Таварыства барацьбы з туберкулёзам» прапаноўвала лячэбны пансіён у Крыме за 70–100 руб. у месяц. 6-тыднёвы курс лячэння на Каўказскіх гразелячэбніцах каштаваў адносна нядорага – 85 руб. [12]. Ад сур'ёзных хвароб за месяц вызваліцца нельга, а лячыцца, па заўвагах многіх настаўнікаў, трэба было «на цэлы век», бо існавала вельмі малая верагоднасць і магчымасць зноў куды-небудзь паехаць.

Шмат намаганняў прыклалі таварыствы, каб у 1910 г. арганізаваць санаторыі і кумысалячэбніцы ў стэпавай мясцовасці Арэнбургскай і Уфімскай губерняў, а таксама настаўніцкія калоніі ў Магілёўскай губерні для хворых педагогаў. Настаўнікі падавалі прашэнні аб грашовай дапамозе на лячэння сябе і членаў сваёй сям'і, на паездкі да вядомых урачоў у Кіеў, Маскву, Пецярбург, Варшаву. Так, настаўнік Ф. Барысаў з Сенненскага павета прасіў дырэкцыю выдаць «пасведчанне аб беднасці для прад'яўлення такога адміністрацыі каўказскіх Мінеральных Водаў на прадмет бясплатнага карыстання водамі і гразямі», бо «на далейшае лячэнне няма ніякіх сродкаў, за тры гады лячэння патрачана ўсё да капейкі і нават маюцца пазыкі» [13].

У 1903 г. вялікую дапамогу аказала Доктарскае аддзяленне губернскага праўлення, якое паведаміла ў Мінскае таварыства, што цыркулярна прадпісана сельскім урачам у выпадку хваробы вясковых настаўнікаў ці членаў іх сямей лячыць іх бясплатна.

Гродзенскае таварыства задалося мэтай заснаваць у Друскеніках настаўніцкі санаторый. Яно набыло ў гэтым курорце дзве хаты з мэбляй і ўсім неабходным. Дзейнасць санаторыя пачалася з адкрыцця сезона ў маі 1913 г. Бясплатную кватэру змаглі выкарыстаць у гэтым годзе 15 настаўнікаў і члены іх сямей. Акцыянернае таварыства Друскеніцкіх мінеральных вод ахвотна прадставіла карыстанне лячэбнымі ваннамі са скідкай 20% з устаноўленай платы. У гэтым жа 1913 г. Рагачоўскае аддзяленне атрымала права карыстання двума пакоямі ў будынку курорта Есентукі. Віцебскае праўленне дамаглося льготных умоваў лячэння для трох настаўнікаў на Кемернскіх мінеральных водах: за плату па 30 руб. у месяц яны маглі карыстацца кватэрай, сталом, сернымі ваннамі.

10 лістапада 1899 г. быў прыняты «Статут пахавальнай касы настаўнікаў і настаўніц Віцебскай губерні». Такая каса ставіла мэтай выдачу аднаразовых грашовых дапамог на пахаванне яе памерлых членаў. Збор капіталу на такія выдаткі вёўся і Магілёўскім таварыствам. З 1903 г. яго члены штогод давалі па 1 руб. у новую касу. Правам на дапамогу маглі карыстацца толькі малалетнія дзеці-сіроты, жонка і самыя блізкія сваякі памерлага. Памер дапамог устанаўліваўся неаднолькавы – ад 100 да 400 руб., у залежнасці ад становішча тых, хто яго патрабаваў.

Пэўную ўвагу ўдзялялі таварыствы і задавальненню духоўных патрабаванняў сваіх членаў, што выразілася, у першую чаргу, у стварэнні бібліятэк. Галоўныя клопаты і ініцыятыва зыходзілі ад настаўніцкіх суполак. У 1901 г. апякун Віленскай акругі дазволіў адкрыццё бібліятэк ва ўсіх губернях акругі з мэтай магчымага адукацыйнага ўплыву і падтрымкі на неабходным узроўні ў адносінах падрыхтоўкі і паспяховага выканання абавязкаў педагагічнага персаналу. Такія бібліятэкі з'явіліся ў Мінску, Гродне, Магілёве, Оршы, Чэрыкаве, Горках, Быхаве і іншых гарадах. Але ў той жа час са справаздач іх загадчыкаў бачны вельмі нізкі працэнт наведвання, нягледзячы на тое, што настаўнікі часта скардзіліся на адсутнасць патрэбнай літаратуры. Напрыклад, у Магілёўскай губерні пры 1-м прыходскім вучылішчы за год бібліятэку наведалі толькі 15 чытачоў, у Аршанскай – 4, у Горацкай – таксама 4, у Быхаўскай – 3. Гэта былі бліжэйшыя па месцы жыхарства вясковыя ці гарадскія настаўнікі. Тыя, хто працаваў за 20 вёрст ці больш, аб выдачы кніг амаль і не прасілі [14].

Магілёўскае таварыства звярталася да павятовых земстваў з просьбай аб падпісцы за іх кошт на часопісы і газеты для народных настаўнікаў. Быхаўская і Мсціслаўская ўправы такія прашэнні задаволілі. Таварыства ставіла таксама пытанне аб стварэнні перасоўных бібліятэк, аб летніх курсах, экскурсіях, якія павінны былі мець «пастаянны характар і накіроўвацца на пашырэнне знаёмства настаўніка з радзімай, яе знакамітымі святынямі і культурнымі цэнтрамі». Так, падчас калядных вакацый 1910–1911 гг. адбыліся дзве экскурсіі выкладчыкаў пачатковых вучылішчаў Віленскай навучальнай акругі. Пецярбург наведалі 17 настаўнікаў з Віленскай, 8 – з Віцебскай, 8 – з Гродзенскай, 12 – з Мінскай і 10 – з Магілёўскай губерняў. У Маскве пабывалі 25 народных настаўнікаў [15].

Газеты і часопісы былі больш даступнымі для настаўнікаў, чым кнігі. На пачатку XX ст. у Расіі выходзіла вялікая колькасць перыядычных выданняў, прысвечаных пытанням выкладання і выхавання, арыентаваных на розныя катэгорыі і ўзрост чытачоў: «Народный учитель», «Русский начальный учитель», «Русская школа», «Учительский вестник» і інш. [16]. На Беларусі выходзілі афіцыйныя часопісы: «Циркуляр по Виленскому учебному округу» і з 1901 г. як дадатак «Народное образование в Виленском учебном округе». Таварыствы ўзаемадапамогі наладжвалі і свае выдавецтвы. Так, у сакавіку 1908 г. група настаўнікаў Віцебскай губерні выпусціла педагагічны часопіс «Голос учителя», а з 1909 г. – ужо другі, які выходзіў у Пецярбургу – «Белорусский учитель» (выйшаў 1 нумар). У 1910 г. Магілёўскае настаўніцкае таварыства распачало выданне «Белорусского учительского вестника» (выйшла 6 нумароў), а ў 1911–1914 гг. выйшаў у свет часопіс «Педагогическое дело» Гродзенскага таварыства. На іх старонках адлюстроўваліся пытанні метадаў выкладання, рэформы школы, увядзення ўсеагульнага навучан-

ня, падрыхтоўкі настаўнікаў, іх становішча, умовы працы і інш. Грамадска-палітычная і нацыянальна-культурная арыентацыя гэтых выданняў была розная, што адбілася на іх лёсе. Першыя тры, якія адлюстроўвалі прагрэсіўныя настроі беларускага настаўніцтва, забаранілі пасля выхаду першых нумароў у сувязі з антыўрадавым характарам выступленняў, а «Педагогическое дело» як часопіс ліберальна-асветніцкага кірунку змог выдаць 12 нумароў і таксама быў закрыты [17].

У часы першай сусветнай вайны пачала згортвацца дзейнасць педагагічных таварыстваў. Так, са справаздачы Мінскага таварыства за 1916 г. бачна, што пазыка выдадзена толькі аднаму члену ў памеры 30 руб.; інтэрнаты не працавалі, навучальныя ўстановы дзейнічалі ў абмежаванай колькасці. У 1916 г. не паступалі членскія ўзносы, і па абставінах ваеннага часу не было і агульных сходаў ні ў 1915, ні ў 1916 г.

У 1903 г. было створана «Таварыства ўзаемадапамогі вучачым і вучыўшым у царкоўных школах Гродзенскай епархіі». Яно ставіла мэту «дапамагаць жывучым у нястачы настаўнікам царкоўных школ Гродзенскай епархіі». У адрозненне ад педагагічных таварыстваў настаўнікаў, якія працавалі ў народных вучылішчах, у епархіяльныя суполкі ўваходзілі ўсе выкладчыкі царкоўных школ. Праўленне спачатку знаходзілася ў Беластоку, а з 1911 г. пераехала ў Гродна. З 1907 г. удзел у таварыстве выкладчыка двухкласных і аднакласных царкоўна-прыходскіх школ стаў абавязковым. Як і ў арганізацыях народных настаўнікаў, сродкі «вучачых» у царкоўных школах складалі членскія ўзносы, ахвяраванні, выпадковыя паступленні. Настаўнікі другакласных школ плацілі штогод 6 руб., двухкласных і аднакласных царкоўна-прыходскіх школ з заробкам не менш за 240 руб. – 3 руб. 56 кап., хто атрымліваў меншы даход – 2 руб. 40 кап. [18]. Асноўная дзейнасць таварыства заключалася ў выдачы грашовых пазык і дапамог у выпадках хваробы, смерці, пажару і г. д. Дапамогі маглі быць як аднаразовыя, так і пастаянныя. Апошнія выдаваліся тым, хто страціў працу не па свайму жаданню, у памеры не больш 10 руб. на працягу 6 месяцаў. У 1906 г. аднаразовую дапамогу змаглі атрымаць толькі 2 настаўнікі: адзін у памеры 20 руб. на лячэнне жонкі, другі – 50 руб. таксама на лячэнне і ў сувязі з пажарам, які знішчыў усю маёмасць. У 1908–1909 гг. дапамогі атрымалі ўжо 46 чалавек (15 – па 40 руб., астатнія – 15–30 руб.). Разам з тым на рахунку таварыства знаходзілася даволі значная сума – 7176 руб. Акрамя таго, праўленне таварыства займалася пошукамі працы для настаўнікаў, запрашала і аплачвала візіты ўрачоў. У сонечнай палавіне Друскеніцкай царкоўнай школы быў наладжаны санаторый для хворых настаўнікаў. На яго ўтрыманне штогод адпускалася па 100 руб. [19].

Такім чынам, у XX ст. з усёй вастрынёй паўстала пытанне рэфармавання сістэмы адукацыі. Народныя настаўнікі пачалі самастойную барацьбу за паляпшэнне свайго становішча і стварылі прафесійныя аб'яднанні – таварыствы ўзаемнай дапамогі. Не перабольшваючы магчымасцей гэтых суполак, можна сцвярджаць, што яны былі першай формай прафесійнага руху народнага настаўніцтва, зародкам яго прафсаюзаў. Значнасць таварыстваў заключалася ў тым, што яны адыгралі пэўную станоўчую ролю ва ўздыме матэрыяльнага становішча і сацыяльнага статуса народнага настаўніка. Нягледзячы на міністэрскія забароны нават на элементарныя вучэбна-дыдактычныя і культурна-асветніцкія мерапрыемствы, настаўніцкія арганізацыі прыцягвалі ўвагу грамадскасці да пытанняў адукацыі, крытыкавалі яе недахопы і імкнуліся ўнесці свой пасільны ўклад у справу пашырэння народнай асветы.

### Літаратура


1. Открытие Общества взаимного вспомоществования учителям и учительницам народных училищ Витебской губернии. – Витебск, 1898. – С. 6.
2. НГАБ. Ф. 2254. Воп. 2. Спр. 785. Л. 37.
3. НГАБ у г. Гродна. Ф. 103. Воп. 1. Спр. 53. Л. 1.
4. НГАБ. Ф. 504. Воп. 1. Спр. 2. Л. 12.
5. Кукушкин И. П. Последнее десятилетие в истории Витебской Дирекции народных училищ (1891–1901). – Витебск, 1904. – Л. 47.
6. НГАБ. Ф. 2254. Воп. 2. Спр. 685. Л. 4.
7. НГАБ. Ф. 2254. Воп. 2. Спр. 315. Л. 1.
8. НГАБ. Ф. 2254. Воп. 2. Спр. 685. Л. 32.
9. НГАБ. Ф. 2254. Воп. 1. Спр. 785. Л. 25–37.
10. НГАБ. Ф. 504. Воп. 1. Спр. 23. Л. 23.
11. Учительский дом // Народное образование в Виленском учебном округе. – 1914. – № 1. – С. 26.
12. Саломатин П. Как живет и работает народный учитель. – СПб., 1911. – С. 56.
13. НГАБ. Ф. 2254. Воп. 2. Спр. 263. Л. 32.
14. НГАБ. Ф. 2254. Воп. 2. Спр. 281. Л. 68–72.
15. Описание экскурсий учащихся Виленского учебного округа за 1910 г. / Сост. А. И. Шестов. – Вильна, 1911. – С. 152, 167.
16. Сучков И. В. Социальный и духовный облик учительства России на рубеже XIX–XX веков // Отечественная история. – 1995. – № 1. – С. 62.
17. Снапкоўская С. В. Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі. – Мн., 1995. – С. 83.
18. Смета прихода и расхода сумм Общества вспомоществования учащим и учившим в церковных школах Гродненской епархии на 1907 г. // Гродненские епархиальные ведомости. – 1907, 15 апреля. – С. 145.
19. Отчет Общества вспомоществования учащим и учившим в церковных школах Гродненской епархии за 1906 г. // Гродненские епархиальные ведомости. – 1897, 4 марта. – С. 69.